# ПАД ЗОЛКІМ НЕБАМ

## Лірычная паэма

### • Паводле бацькоўскіх успамінаў

**Кожны чалавек на свеце з маленства павінен ведаць, хто былі яго продкі, з якога паходзілі роду, як жылі, што рабілі. Гэта веданне пераходзіць з пакалення ў пакаленне. З маіх родзічаў — бацькоў і дзядоў — няма ўжо ў жыцці нікога. Але я добра ведаю сваю радаслоўную. Маці мая Марыя — нарадзілася ў сям'і майго дзеда Яфіма Пруднікава, была адной з адзінаццаці яго дачок. Бацька Фёдар Савельевіч Прыходзька — таксама з мнагадзетнай сялянскай сям'і. Дзед па бацьку Савелій ці проста Саўка, як яго звалі, меў трох сыноў і дзве дачкі. Сям'я Пруднікавых жыла ў вёсцы Альшоў, што каля самага Хоцімска, мела добрую гаспадарку, а сям'я Прыходзькаў — была вельмі беднай сярод усіх, якія жылі ў суседняй недалёку вёсцы Малая Ліпаўка. Саўкіны сыны вымушаны былі ісці ў батракі. А самы малодшы — будучы мой бацька Федзька — яшчэ ў маленстве павінен быў стаць павадыром, вадзіць па ўсяму прыбесядскаму краі з вёскі ў вёску сляпога старца, выпрошваць падаянне, каб прынесці дамоў кавалак хлеба.**

**Пра гэта мне бацька не раз расказваў пазней, калі — пасля смерці маці — я перабраўся ад дзеда Пруднікава жыць да яго і назваўся яго прозвішчам.**

**Бацькавы ўспаміны і леглі ў аснову гэтай кароткай паэмы.**

**Пятро ПРЫХОДЗЬКА.**

Я помню сумны бацькаў успамін:
Яму яшчэ ва ўзросце хлапчука
Лёс выпаў — з веданнем
сваіх мясцін
Вадзіць па іх сляпога жабрака.
Сям'я была вялікаю і беднай, —
І стаў малы ў сляпца павадыром.
У подыху сваіх нягод і бедаў
Хадзілі ўдвох яны —
ці снег, ці гром.
Не сніўся хоць адзін шчаслівы міг,
Дарогай вузкаю палёў паміж
Ішлі. І спадарожнікам для іх
Заўсёды быў адзін малебны крыж.
Ідуць — бывала — ўранку
з вёскі ў вёску,
Цераз балота з Ліпаўкі ў Альшоў.
На ўзбоччы хтось араў
сваю палоску,
Насустрач селянін з касой ішоў.
Пераступалі зморaныя ногі
Далей па торных сцежках палявых.
А тое, што вакол,
уздоўж дарогі —
Чужое ўсё, усё гэта не іх...
Ды быў яшчэ здаровы дух у целе,
Не мала мелі слаўных землякоў.
Не думалі аб тым,
што свет падзелен
Спрадвеку на паноў і жабракоў.
Няўцям было малому і старому, —
Чаму нястача ўслед ідзе гурмой.
У іх адна дарога — з дома к дому,
Пад золкім небам летам і зімой.
Жабрак — заўжды батрак
зямлі і неба.
Праз плыні цёплых і халодных
дзён
За падаяннем, за скарынкай хлеба
Ідзе, не знаючы спачыну, ён.
Пад ім — зямля, увесь свет
над галавою,
Кій у руках і торба на плячы.
Нічога больш: але ж усё жывое,
Усе чуюць, родным краем ідучы.
Уласнасці ж у жабрака ніякай
Апроч скарынкі чэрствай і сумы.
Але заўжды паклоніцца з падзякай
Усім за хлеб між лета і зімы.
І ён бы мог штогод у чыстых росах
Сваё вырошчваць жыта на палях.
Але ж адно наканавана лёсам —
Шматвёрстны пад малебным
крыжам шлях...
На гэтым скончыў бы я свой
аповед
Пра старца —
пра сляпога жабрака,
Але нявыказаным словам повен, —
На сэрцы быдта бацькава рука.
Яшчэ запомніў я з ягоных слоў,
Як надавалі клічку жабраку.
Аднойчы ён у дом знаёмы ўвёў
Сляпога старца, ўзяўшы за руку.
У доме тым—багатым ды скупым—
Спыніліся ў парозе ўдвох яны.
Ніхто нічога не падносіць ім,
Пякуцца ў печы смачныя бліны.
І гаспадыня цягне на патэльні
Пшанічных смажаных бліноў гару.
Абодвум захацелася так вельмі
Хоць бы крупіцу ў ранную пару.
Сляпы стаіць, не просячы нічога,
Ад жару ў печы аж увесь упрэў.
А павадыр малы, згадаўшы Бога,
Прамовіў голасна:
«Цёць, блін згарэў!».
Агарчык цётка кінула малому, —
Нібыта ўбіла ў сэрца нейкі клін.
І ўжо сялянскі хлопчык з таго дому
Пайшоў з мянушкаю —
«гарэлы блін»...
Ты не шукай, чытач,
тут параўнанняў
Былых гадоў з сягоннiшнім
жыццём.
Усе мы розныя, у розных званнях
Кудысьці ўсё імкнёмся, ўсё ідзём.
Былі і ёсць свае паны, падпанкі, —
І сёння ж недзе ходзяць жабракі,
Згасаюць знічкі,
ўспыхваюць заранкі,
Праносяцца па-над зямлёй вякі.
Сваімі звычкамі, сваёй мовай
Нам жыць бы, ганарыцца
з веку ў век,
Край выратоўваць ад бяды замовай
У спелым жыце, звоне чыстых рэк.
І я хадзіў шмат роднай стараною
Праз бітвы і варожыя тылы.
Але заўжды стаяць перада мною
Стары жабрак і павадыр малы.
Я ад душы абняў бы іх па-брацку,
Дзе падаюць лісточкі спарыша.
Хоць бедны чалавек —
але жабрацкай
Не можа быць ягоная душа,
Радзіма-маці, ўся зямля, якую
Ён змог уздоўж і ўпоперак
прайсці, —
Яму ўсяліла песню мо такую,
Якой ты сам не чуў яшчэ ў жыцці.
Нічым нікому не абняць планеты,
Што на сябе ўзяла цяжар вякоў.
І з жабракоў з'яўляліся паэты,
Іх геніяльных тысячы радкоў.
Кім бы ні быў ты і якім бы імем
Цябе не ахрысціў жыццёвы лёс, —
Усю любоў сваю аддай Радзіме,
Яе палям, лясам, святлу нябёс!
І дзе б ні жыў — на Пцічы
ці на Каме, —
Рабі, каб шлях усіх
да дружбы вёў,
Каб нам не быць ніколі жабракамі
Нідзе на свеце між усіх краёў!

7 жніўня 1997 г.

**Прыходзька, П.** Пад золкім небам : лірычная паэма : паводле бацькоўскіх успамінаў / Пятро Прыходзька // Шлях Кастрычніка. — 1997. — 30 жніўня. — С. 3.